Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Затрыманні перад новай акцыяй супраць інтэграцыі з Расіяй дапоўнена

20.12.2019 **Тэгі**: апазіцыя, затрыманні




Вадзім Саранчукоў. Фота – Васіль Малчанаў/«Белсат»

**Намесніка старшыні Партыі БНФ Вадзіма Саранчукова ў Горадні затрымала міліцыя. Пра гэта паведаміў мясцовы актывіст Сяргей Верамеенка, піша "Белсат".**

Імаверна, затрыманне звязанае з сённяшняй акцыяй у абарону незалежнасці, што мусіць адбыцца ў Менску на Кастрычніцкай плошчы. Гарадзенскія актывісты таксама планавалі прыняць удзел у пратэстах.

15 снежня Саранчукоў браў удзел у маніфестацыі ў абарону незалежнасці ў Горадні.

Пазней у Гародні затрыманы таксама грамадскі актывіст **Сяргей Верамеенка**. Яго павезлі ў РАУС на вуліцы Дубко. Паводле папярэдняй інфармацыі Верамеенку затрымалі за ўдзел у акцыі 15 снежня. Верамеенку затрымалі, калі ён збіраўся разам з жонкай на таксі ехаць на працу. Ля дома стаяў бус, на якім Верамеенку павезлі.

Вадзім Саранчукоў знаходзіцца ў РУУС Кастрычніцкага раёна, Верамеенка - у Ленінскім. На іх складаюць пратаколы - верагодна за ўдзел у "Жывым ланцугу" супраць інтэграцыі.

Як паведамляюць гарадзенскія праваабаронцы "Вясны", міліцыя дзяжурыць коля дома актывіста Народнай грамады **Мікалая Саляніка**.

Таксама міліцыя дзяжурыла каля дома намесніка старшыні гарадзенскай філіі АГП **Ежы Грыгенчы.** У выніку яго таксама затрымалі і адвезлі ў РУУС Ленінскага раёна.

Актывіст змог паведаміць праваабаронцам, што прама ў Ленінскім РУУС адбываецца суд над ім.






## "На Піцер!" Нядзельная акцыя супраць інтэграцыі з Расіяй ў Гародні

Грамадскія актывісты Гародні сабраліся 15 снежня на акцыю супраць намераў уладаў Беларусі аб «паглыбленні інтэграцыі» з Расіяй.

Каля дамоў актывістаў "Еўрапейскай Беларусі" **Андрэя Войніча** ў Мінску і **Андрэя Шарэнды** ў Брэсце таксама дзяжураць міліцыянты.

Невядома месца знаходжання аршанскага блогера **Зміцера Казлова (Шэры кот)**. Яго акаунт ва "Вконтакте" ўзламаны, у іншых сацыяльных сетках апошнія два дні ён не з'яўляецца. Вядома, што ўчора ў яго мусіць быць суд у Мінску за парушэнне артыкула 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Тэлефон Казлова недаступны.

Пазней стала вядома, што блогер Зміцер Казлоў на волі. Ён прыйшоў на акцыю пратэста ўвечары.

Перад пачаткам акцыі стала вядома, што ў Гародні асудзілі затрыманых апазіцыянераў. Ежы Грыгенча атрымаў **15 базавых штрафу (255 рублёў)**, Вадзіму Саранчукову - **25 базавых (637,5 рублёў)** штрафу, Сяргею Верамеенку - **30 базавых (765 рублёў)** штрафу. Зараз яны на волі.

Нагадаем, што 18 снежня ў Мінску былі затрыманы палітык **Павел Севярынец**, лідар "Маладога фронту" **Дзяніс Урбановіч**, актывісты "Еўрапейскай Беларусі" **Яўген Афнагель і Максім Вінярскі**. Усе яны былі асуджаны ў той жа дзень за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (артыкул 23.34 КаАП) і атрымалі па 15 сутак арышту. Севярынца ў той жа дзень адпусцілі, астатніх змясцілі ў ЦІП.




## У Мінску затрымліваюць актывістаў, якія выходзілі на мітынг супраць інтэграцыі з Расіяй

У Мінску 18 снежня пачалі затрымліваць актывістаў і палітыкаў, якія ўдзельнічалі ў мітынгах 7 і 8 снежня супраць паглыбленай інтэграцыі з Расіяй. Некаторых асудзілі на суткі і адправілі ў ЦІП, дзе яны і правядуць калядныя святы.

*Інфармацыя будзе дапаўняцца.*

---

***Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал*** *https://t.me/viasna96*

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



## "Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

## Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

## "Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

## "КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

## Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



## #ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ






Напрамкі дзейнасці

## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY